## РЭФЕРАТ

СЯМАШКА АЛЕНЫ УЛАДЗІМІРАЎНЫ

## СРОДКІ МАСТАЦКАЙ ВЫРАЗНАСЦІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ( НА ПРЫКЛАДЗЕ КНІГІ ВЕРШАЎ МІХАСЯ БАШЛАКОВА “ВІНО АДЗІНОКІХ”)

**Ключавыя словы:** троп, эпітэт, метафара, параўнанне, метанімія, сінекдаха, літота, гіпербала, каламбур, аманімія, паранамазія, перыфраза, стылістычныя фігуры, анафара, эпіфара, падваенне, кальцо страфы, паралелізм, сімплака, кампазіцыйны стык, шматзлучнікавасць (полісіндэтон), бяззлучнікавасць (асіндэтон), рытарычныя пытанні, рытарычны вокліч, недасказ, эліпсіс, анакалуф, інверсія, антытэза.

**Аб’ектам даследавання** з’яўляецца кніга вершаў Міхася Башлакова “Віно адзінокіх”.

**Прадмет даследавання** – сродкі мастацкай выразнасці ў кнізе вершаў Міхася Башлакова “Віно адзінокіх”.

**Мэта дыпломнай работы** – даследаваць сродкі мастацкай выразнасці ў сучаснай беларускай паэзіі (на прыкладзе кнігі вершаў Міхася Башлакова “Віно адзінокіх”).

**Навуковая навізна** даследавання заключаецца ў тым, што тропы і фігуры мовы здаўна прыцягваюць да сябе ўвагу, з’яўляючыся прадметам інтарэсаў паэтыкі, рыторыкі, лінгвістыкі і літаратурнай тэорыі. Чытач пранікае ў свет вобразаў мастацкага твора праз яго маўленчую тканіну. І таму роля мовы ў стварэнні мастацкага вобраза цяжка пераацаніць. Увага навукоўцаў да дадзенай праблематыкі тлумачыцца актыўным развіццём новых кірункаў у моваведстве (лінгвастылістыка, кагнітыўная лінгвістыка), якія забяспечылі магчымасць адэкватнага апісання сутнасці і функцый сродкаў выразнасці ў тэксце. Аднак, нягледзячы на наяўнасць цэлага шэрагу прац, шматлікія пытанні застаюцца дыскусійнымі, а некаторыя аспекты няпоўна вывучанымі. Усё гэта дазваляе гаварыць пра несумненную важнасць і актуальнасць вывучэння сродкаў выразнасці.

**Практычная значнасць** даследавання заключаецца ў выкарыстанні асноўных яго вывадаў пры далейшай распрацоўцы праблем вобразных сродкаў у сучаснай беларускай паэзіі, а таксама пры падрыхтоўцы курсавых прац студэнтамі філалагічных спецыяльнасцей ВНУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускага мовазнаўства

# СРОДКІ МАСТАЦКАЙ ВЫРАЗНАСЦІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ( НА ПРЫКЛАДЗЕ КНІГІ ВЕРШАЎ МІХАСЯ БАШЛАКОВА “ВІНО АДЗІНОКІХ”)

Дыпломная работа
студэнткі 52 групы
5 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура.
Руская мова і літаратура»
дзённай формы
атрымання адукацыі
_________ Сямашка Алены
Уладзіміраўны

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
_________М.В. Шабовіч

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ____ _____________
(подпіс)(прозвішча,ініцыялы)

Пратакол № 10 ад 25.04 2016г.

Абаронена 23 чэрвеня 2016г.
з адзнакай «8 (восем)»

Мінск, 2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ